Афіцыйна

# ПАВЫСІЦЬ ПРЭСТЫЖ ТЭРМІНОВАЙ ВАЕННАЙ СЛУЖБЫ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў закон «Аб змяненні законаў па пытаннях эфектыўнага функцыянавання ваеннай арганізацыі дзяржавы», паведаміла прэс-служба кіраўніка дзяржавы.**

Закон прыняты ў мэтах падтрымання пастаяннай баявой гатоўнасці Узброеных Сіл ва ўмовах актывізацыі ваеннай дзейнасці ў свеце і Еўропе. Акрамя таго, існуюць аб'ектыўныя дэмаграфічныя праблемы: істотна зменшылася колькасць маладых людзей прызыўнога ўзросту. У той жа час колькасць катэгорый грамадзян, якія ў адпаведнасці з заканадаўствам не прызываюцца на тэрміновую ваенную службу або службу ў рэзерве (цяпер гэта 76 катэгорый), з'яўляецца найбольшай на постсавецкай прасторы і ў краінах далёкага замежжа.

«Прынцыпова важна, што захаваны ўсе адтэрміноўкі па стане здароўя, сямейным становішчы і іншыя, якія прадстаўляліся раней, — падкрэслілі ў прэс-службе. — Змены закранулі прадстаўленне адтэрміновак для працягу адукацыі: уводзіцца прынцып аднаразовасці прадстаўлення адтэрміноўкі».

Таксама закон абмяжоўвае прыняцце на дзяржаўную службу, службу ў органах сістэмы забеспячэння нацыянальнай бяспекі грамадзян, якія не прайшлі вайсковую службу, не маючы на тое законных падстаў (ухіліліся ад прызыву).

Законам унесены змяненні ў Кодэкс аб адукацыі. Цяпер выпускнікі, якія атрымалі месца работы па размеркаванні або былі накіраваныя на работу ў адпаведнасці з дагаворам аб падрыхтоўцы навуковага работніка вышэйшай кваліфікацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, дагаворам аб мэтавай падрыхтоўцы спецыяліста, пры добраахвотным паступленні на ваенную службу па кантракце, праслужыўшы не менш тэрміну абавязковай работы, вызваляюцца ад вяртання ў рэспубліканскі і (або) мясцовыя бюджэты сродкаў, затрачаных дзяржавай на іх падрыхтоўку.

«Усе адтэрміноўкі для працягу адукацыі, якія былі прадстаўлены да ўступлення ў сілу закона, будуць захоўвацца да страты падстаў, па якіх яны прадстаўлены», — адзначылі ў прэс-службе Прэзідэнта.

Адначасова кіраўнік дзяржавы даручыў ураду прапрацаваць комплекс мер, накіраваных на павышэнне прэстыжу тэрміновай ваеннай службы.

Закон уступае ў сілу праз дзесяць дзён пасля афіцыйнага апублікавання.

# ВЕКТАР СУПРАЦОЎНІЦТВА

## Першы Форум рэгіёнаў Беларусі і Узбекістана пройдзе ў Мінску на пачатку наступнага тыдня

**Мерапрыемствы адбудзецца ў рамках афіцыйнага візіта ў Беларусь Прэзідэнта Узбекістана Шаўката Мірзіёева.**

У панядзелак і аўторак — 29—30 ліпеня — беларуская сталіца ператворыцца ў пляцоўку для абмеркавання двухбаковага супрацоўніцтва па шматлікіх кірунках: у галінах прамысловай кааперацыі, АПК, харчовай прамысловасці і прадуктовай бяспекі, а таксама ў гуманітарнай, інфармацыйна-камунікацыйнай і навуковай сферах. Гэтыя тэмы будуць знаходзіцца ў цэнтры ўвагі падчас работы трох тэматычных секцый.

Сярод удзельнікаў Форуму — прадстаўнікі рэгіёнаў, міністэрстваў і ведамстваў, дзелавых колаў, парламентарыі дзвюх краін. Дэлегацыю Узбекістана на Форуме ўзначаліць першы намеснік старшыні Сената Олій Мажліса Садык Сафаеў.

Галоўнай жа тэмай пленарнага пасяджэння, якое адбудзецца ў Палацы Рэспублікі ў другі дзень работы Форуму, стане супрацоўніцтва рэгіёнаў як ключавы фактар развіцця міждзяржаўных адносін.

Трэба сказаць, што тавараабарот паміж краінамі летась вырас на 20 % у параўнанні з пазалеташнім перыядам.

Плануецца, што на пляцоўках Форуму будзе падпісана каля 15 міжрэгіянальных дагавораў аб супрацоўніцтве, а таксама камерцыйныя кантракты. Госці і наведвальнікі мерапрыемства атрымаюць магчымасць пазнаёміцца з выстаўкай-кірмашом узбекскіх тавараў.

Між іншым, эканамічныя стасункі — не адзінае, што яднае і прыцягвае два бакі. У межах Форуму ў Мінску запланавана ўрачыстае адкрыццё помніка-бюста ўзбекскаму паэту Алішэру Наваі.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# ПЕРШЫ Ў МНОГІХ СЭНСАХ

## Беларусь і Узбекістан імкнуцца да тавараабароту ў мільярд долараў

**Беларуска-ўзбекскі гандаль мае велізарны патэнцыял. Такую ўпэўненасць выказаў учора Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Узбекістана ў Беларусі Насірджан Юсупаў. Як вядома, кіраўнікі абедзвюх дзяржаў паставілі задачу на бліжэйшыя гады па дасягненні тавараабароту ў 1 мільярд долараў.**



По словах пасла, летась тавараабарот паміж нашымі краінамі склаў 420 мільёнаў долараў, павялічыўшыся ў 2,3 раза ў параўнанні з папярэднім годам.

«Галоўнае, мы павінны забяспечыць развіццё рэгіянальных сувязяў. Калі рэгіёны пачнуць працаваць, нашы патэнцыйныя магчымасці будуць рэалізаваныя. Не сумняваюся, што ў бліжэйшы час гэтая лічба будзе дасягнутая», — адзначыў кіраўнік дыпмісіі.

Ён падкрэсліў, што Беларусь і Узбекістан — не канкурэнты, наадварот, эканомікі бакоў дапаўняюць адна адну. Таму, на думку Насірджана Юсупава, трэба аб'ядноўваць магчымасці і вырашаць свае праблемы.

Такой мэце паслужыць і першы Форум рэгіёнаў Беларусі і Узбекістана, які мае адбыцца 29—30 ліпеня ў Мінску. У дэлегацыі сяродняазіяцкай краіны будзе каля 120 прадстаўнікоў дзяржаўных органаў, мясцовай улады, бізнес-супольнасці, патэнцыйных інвестараў. Як паведаміў пасол, падчас Форуму плануецца падпісанне пагадненняў аб рэгіянальным супрацоўніцтве, а таксама камерцыйных дагавораў.

Пазнаёміцца з магчымасцямі гандлю і вытворчасці запрашаюць на выстаўку «Зроблена ва Узбекістане», што пройдзе з панядзелка да пятніцы на «БелЭкспа». На выстаўцы будзе прадстаўлена каля тысячы найменняў прадукцыі ад 80 прадпрыемстваў, у тым ліку арыентаваных на экспарт.

**Намеснік міністра эканомікі і прамысловасці Узбекістана Сахіб САІФНАЗАРАЎ** удакладніў, што экспанавацца будуць тэкстыльныя і скураныя вырабы, бытавая тэхніка, будаўнічыя матэрыялы, лакафарбавая і хімічная прадукцыя, а таксама прадукты харчавання. Сваё майстэрства прадэманструюць народныя ўмельцы, а дзесяць рэгіёнаў краіны прадставяць свой патэнцыял у розных галінах.

«Галоўнае, чаго мы здолелі дасягнуць, — узаемадзеянне і сумесная работа нашых рэгіёнаў. Думаю, гэта дасць штуршок для далейшага развіцця нашых адносін», — падкрэсліў Сахіб Саіфназараў.

Да таго ж І Форум рэгіёнаў стане для беларусаў магчымасцю згадаць ці даведацца больш пра ўзбекскае мастацтва: 30 ліпеня пачынаюцца Дні культуры краіны, на працягу якіх свае таленты падораць беларускай сталіцы вядомыя калектывы, мастакі, умельцы. А напярэдадні запланавана адкрыццё бюста паэта і асветніка Алішэра Наваі.

«Гэта — першы помнік дзяржаўнаму дзеячу Усходу, Узбекістана тут, у Беларусі. Мы ганарымся, што беларускі бок ініцыяваў стварэнне гэтага помніка, скульптарам таксама выбраны беларус», — падзяліўся Насірджан Юсупаў.

Беларускі лідар Аляксандр Лукашэнка наведваў сяродняазіяцкую краіну леташнім вераснем: тады былі распрацаваныя канкрэтныя планы двухбаковага супрацоўніцтва.

«Падчас сустрэчы ў Мінску будуць падведзеныя некаторыя вынікі рэалізацыі дарожнай карты і вызначаныя перспектыўныя кірункі выканання мерапрыемстваў», — паведаміў Насірджан Юсупаў.

**Варвара МАРОЗАВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### «Ніхто з брытанскіх прэм'ераў не сутыкаўся з такімі цяжкасцямі...»



Вялікабрытанія набыла новага прэм'ер-міністра: лідарам кансерватыўнай партыі і кіраўніком кабінета абралі 55-гадовага Барыса Джонсана, перакананага прыхільніка выхаду сваёй краіны з Еўрапейскага саюза. Перамогу Джонсана абмяркоўваюць СМІ Злучанага Каралеўства.

**Financial Times:** Рэдка калі брытанскі прэм'ер-міністр мірнага часу сутыкаўся з такімі сур'ёзнымі абставінамі, як тыя, што чакаюць Барыса Джонсана, калі ў сераду ён увойдзе ў рэзідэнцыю кіраўніка ўрада на Даўнінг-стрыт. Нячаста таксама з'яўляўся новы прэм'ер, які норавам, характарам і паслужным спісам настолькі б не адпавядаў важнасці задачы.

**The Times:** Ужо ёсць нямала каментатараў, якія прадказваюць, што Джонсану ў хуткім часе давядзецца складаць паміжнальную прамову па ўласным перыядзе знаходжання на пасадзе прэм'ера. Тым не менш у яго звароце прагучалі намёкі на з'яўленне прывабнага прэм'ера-торы для адзінай нацыі, якім яму самому хацелася б сябе бачыць.

**The Daily Telegraph:** Ні адзін брытанскі прэм'ер-міністр ніколі не ўваходзіў у рэзідэнцыю на Даўнінг-стрыт пасля такой здзеклівай крытыкі з боку вядучых сусветных СМІ. Вобраз непапраўнага блазна, які вядзе аслабленую краіну ў тупік, прыжыўся. Карыкатура — гэта крыж, які павінен несці Барыс.

**BBC:** Тое, што дасталася Джонсану ў спадчыну ў палітычным плане, носіць усе прыкметы катастрофы. У Джонсана няма большасці ў Палаце абшчын, няма мандата шырокай грамадскасці, бо яго абралі толькі члены партыі торы. Паўсюль палітычныя праблемы.

### Вызначаны шанцы Украіны на збліжэнне з Расіяй

Аналітыкі рэйтынгавага агенцтва Moody's ацанілі шанцы Украіны на збліжэнне з Расіяй пасля выбараў у Вярхоўную Раду. Пра гэта піша РБК.

Яны назвалі пазітыўным момантам перамогу партыі кіраўніка дзяржавы Уладзіміра Зяленскага «Слуга народа», адзначыўшы гатоўнасць яго каманды праводзіць рэформы і ўмацоўваць адносіны з Захадам. Эксперты перакананы, што Кіеў працягне палітыку еўраінтэграцыі, аднак будзе менш імкнуцца ўвайсці ў НАТА. Пры гэтым нармалізацыя адносін з Расіяй малаверагодная, сцвярджаюць у Moody's. Пазіцыя Украіны будзе абарончая, а не канфрантацыйная, аднак фактарам рызыкі застаецца канфлікт на паўднёвым усходзе краіны.

### El Pais: Apple праслухоўвае галасавыя каманды карыстальнікаў і прыватныя гутаркі

Карпарацыя Apple праз субпадрадныя прадпрыемствы наймае работнікаў, якія праслухоўваюць галасавыя каманды карыстальнікаў, а таксама іх асабістыя размовы. Пра гэта паведаміла газета El Pais.

Паводле яе інфармацыі, у кампаніі маюцца супрацоўнікі ў Іспаніі, якія слухаюць запісы на розных мовах, у тым ліку на французскай і нямецкай. Па словах крыніц газеты, гэта робіцца для паляпшэння праграмнага забеспячэння электроннага галасавога памочніка Siri. Тым не менш, па звестках выдання, аналізу падвяргаюцца не толькі прамыя запыты, але і прыватныя гутаркі карыстальнікаў.

Праслухоўванне запісаў ажыццяўляецца праз субпадрадныя прадпрыемствы. У сваю чаргу, кампанія запэўніла, што «усе прадукты і паслугі Apple прызначаныя для забеспячэння бяспекі асабістай інфармацыі: толькі карыстальнік вырашае, чым і з кім дзяліцца».

Трэба ведаць

# САМАВЫВАЗ ТАВАРАЎ — БЯСПЛАТНЫ

**Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю звяртае ўвагу на непраўамернасць спагнання платы за самавываз тавараў з пунктаў выдачы інтэрнэт-магазінаў, паведамляецца на афіцыйным сайце ведамства.**

Апошнім часам у МАРГ паступае мноства зваротаў спажыўцоў па гэтым пытанні. У сувязі з гэтым у міністэрстве нагадваюць: продаж тавараў у інтэрнэт-магазінах адносіцца да гандлю па ўзорах. Парадак яго ажыццяўлення рэгулюецца Грамадзянскім кодэксам, законам аб дзяржрэгуляванні гандлю і грамадскага харчавання ў Беларусі, законам «Аб абароне правоў спажыўцоў», а таксама правіламі продажу тавараў пры ажыццяўленні рознічнага гандлю па ўзорах, зацверджаных пастановай Саўміна.

У прыватнасці, згодна з законам аб абароне правоў спажыўцоў, прадавец абавязаны аказваць садзейнічанне спажыўцу ў свабодным выбары тавару (работы, паслугі). Пры гэтым яму забаронена абумоўліваць іх набыццё абавязковым набыццём іншых тавараў (работ, паслуг), а таксама без згоды спажыўца прадастаўляць дадатковыя платныя работы або паслугі. Расходы на перамяшчэнне тавару павінны ўлічвацца ў яго цане (гандлёвай надбаўцы да адпускной цаны тавару).